**М.І. Чмарава**
*(Магілёў)*

# ДРУГАЯ СУСВЕТНАЯ ВАЙНА Ў ТВОРЧАСЦІ СЛАВЯНСКІХ АЎТАРАЎ (1948 – 1960 гг.)

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Выяўленне другой сусветнай вайны ў мастацкіх творах славянскіх аўтараў – значны здабытак кожнай з літаратур. Але не ва ўсіх з іх на працягу другой паловы ХХ стагоддзя тэма вайны асвойвалася аднолькава інтэнсіўна. Розны гістарычны досвед, нацыянальныя традыцыі, палітычныя сістэмы ў краінах, псіхалагічныя асаблівасці абумовілі месца і характар мастацкага ўвасаблення праблематыкі вайны. У беларускай літаратуры, напрыклад, яна – галоўная і вызначальная, у рускай адна з вызначальных, у балгарскай яе доля не такая значная. У чэшскай літаратуры франтавая тэма, як і партызанская, не магла заняць такога месца, як у славацкай ці югаслаўскай; у польскай літаратуры, напрыклад, тэматычную аснову складаюць гвалтоўнасць паражэння, верасень 1939 г., "інтэлігенцкія разлікі", трагедыя Варшавы і канцлагераў. У славацкай літаратуры задае тон праблематыка маўклівай пакуты вайскоўца, якога прымусілі змагацца супраць яго волі; у чэшскай – "пошукі пратэсту ва ўмовах пратэктарату"; у югаслаўскай – максімалізм антыфашыстаў-рэвалюцыянераў і грамадзянская вайна. Беларуская літаратура, як усе савецкія, даследавала вызваленчую барацьбу, гераізм на фронце, канфлікт паміж партызанамі і паліцаямі ў тыле, жыццё пад акупантамі.

Пераўнальны аналіз асобных твораў на ваенную тэму дае магчымасць даследаваць тыпалагічныя рысы: агульны вектар эвалюцыі літаратур пра вайну ў розных нацыянальных літаратурах, эвалюцыю ад дакументалізму і ад-

люстравання падзей да філасофскага іх спасціжэння, ад рамантычнай героікі да трагічнага пафасу. Акрамя таго, параўнальны аналіз твораў дазваляе канстатаваць наяўнасць агульных сюжэтаў, вобразаў, сітуацый, нават назваў твораў і агульнай лексікі.

Ва ўсіх літаратурах на першым пасляваенным этапе ў першае дзесяцігоддзе пасля вайны інтэнсіўна развіваецца эпічны жанр, які ахоплівае галоўныя тэмы: гістарычныя вынікі жорсткай барацьбы супраць фашызму, перамогу, ролю ў ёй народных мас, удзел інтэлігенцыі. Сваё вялікае значэнне выканалі творы "стыхійнага аўтабіяграфізму", якія пісаліся ўдзельнікамі і сведкамі падзей вайны і неслі праўдзівасць, якая магла спрачацца з дакументам. Усе пералічаныя творы адлюстроўваюць розны нацыянальны вопыт аднаго пакалення, але блізкія ў жанравых адносінах і ўмоўна могуць разглядацца як аўтабіяграфічная проза.

У рознай ступені праявіліся ў славянскіх літаратурах функцыі літаратуры пра вайну: па-першае, псіхааналітычная, якая задавальняла патрэбу выгаварыцца, выказаць невыносны боль і жах; па-другое, функцыя сведчання, жывога летапісання, што абнародвала факты ўзрушальнага эмацыйнага ўздзеяння. Узятыя з народнай памяці, вусных паданняў, аўтабіяграфічнага досведу аўтара, яны набывалі ў літаратуры статус мастацкага дакумента. Дзякуючы гэтай функцыі чытач знаходзіў у мастацкіх творах больш праўды пра вайну, чым у афіцыйным друку і навуцы. Пэўныя абставіны грамадска-палітычнага развіцця прывялі да замацавання за савецкай літаратурай сацыялістычнага рэалізму пра вайну "функцыіі маніпулятарскай, якой найбольш спрыялі творы, што ўсляўлялі перамогу, ідэальнага воінагероя, войска і правадыра (пасля смерці Сталіна, яго месца заняла кампартыя), паказвалі вызначаную адпаведна ролю народных мас, "нішчылі" ворага, асуджалі індывідуалізм" [1, с. 164].

Маніпулятарскай функцыі ў нейкай ступені адпавядалі такія "родавыя" якасці літаратуры на ваенную тэму, як публіцыстычнасць, ідэалагічная скіраванасць, напружаны батальны сюжэт. Паступова такая літаратура набліжалася да масавай з той заканамернасцю, з якой сацыялістычны рэалізм ператвараўся, па слушным выказванні А. Камю, у "ружовую бібліятэку". Афіцыйна масавая літаратура ў савецкім жыцці адсутнічала, была забаронена, а яе функцыі пераняў сацыялістычны рэалізм. Літаратура пра вайну істотна дэвальвалася: чым менш шчырай праўды, тым больш парадным і спрошчаным выглядаў канфлікт (антыфашызм-фашызм, камуніст-фашыст). Ён у значнай ступені правакаваў люстранoе апісальніцтва, аднаўленне падзей у іх знешнім выглядзе, падзей, адлюстраваных панарамна. Прыгадаем пра гэту спецыфіку развіцця савецкай літаратуры, таму што яна адчувальная ва ўсіх літаратурах былых сацыялістычных краін, канешне, не ў аднолькавай ступені. Літаратура шукала свабоду ў эміграцыі. Парадаксальна, але, здаецца, гэта мала спрыяла "ваенным" аўтарам. Тут адчуваецца свая заканамернасць: вышэйшыя дасягненні літаратура пра вайну мае менавіта ў тых краінах, што найбольш пацярпелі (Польшча, Беларусь, Расія, Югаславія), па абшарах якіх вайна прайшла спусташальна. Відаць, літаратуры пра вайну неабходна была лучнасць з палітай крывёю зямлёю, са сваім чытачом, які перажыў тое, што і сам аўтар, і таму разумее яго і спрыяе яго дзейнасці (выключэннем з'яўляецца хіба што "Скуты розум" (1951) Ч. Мілаша, які напісаны польскім пісьменнікам у 1951 годзе ў эміграцыі).

З пачатку крызісу таталітарызму аднолькава інтэнсіўна ва ўсіх славянскіх літаратурах пра вайну азначылася яшчэ адна функцыя – філасофская. Дзякуючы ёй плённа развіваецца альтэрнатыва афіцыёзна-масавай функцыі, якая робіць акцэнт на экзістэнцыяльных праблемах, на пафасе трагічным і скіраваная да ўнутранага свету асобы. Гэта тэндэнцыя назіраецца і ў некаторых творах першага пасляваеннага дзесяцігоддзя ("Далеко je сунце" (1951) Д. Чосіча; "Kamienny swiat" (1948) Т. Бароўскага, "Hodiny a minuty" (1956), "Skleny vrh" (1954) А. Беднара, "Balada o trobenti in oblaku" (1957) Ц. Космача, але як мастацкая з'ява, са сваёй праблематыкай і паэтыкай, яна складваецца ў 1960-я гады настолькі выразна, што для яе азначэння замацоўваецца тэрмін "ваенная проза", які паспяхова канкурыруе з такімі звыклымі тэрмінамі, як "антыфашысцкая літаратура" і "літаратура пра вайну". Спецыфічная паэтыка прозы ў славянскіх літаратурах як міжлітаратурнай агульнасці (тэорыя распрацавана Д. Дзюрышыным) прасочваецца выразна дзякуючы выкарыстанню методыкі гістарычна-параўнальнага і тыпалагічнага даследу.

Параўнаем раман Ё. Путрамана "Верасень" (1952), сацыяльна-палітычны раман на тэму гвалтоўнай акупацыі Польшчы, і аповесць "Konec vakacіji" (1977) В.Біліньскага, у якой назіраюцца прынцыпова новыя падыходы да тэмы, новы мастацкі вобраз трагічнага Верасня. Першы твор эпічны, у ім фіксуюцца падзеі, другі – філасофская прыпавесць, якая аналізуе ўнутраны змест падзей. Прыярытэт асобы, намаганне асэнсаваць падзеі, іх чалавечы змест, трагедыю і паляка, і немца забяспечылі аповесці В. Біліньскага жанравыя змены ў напрамку філасофскай прыпавесці.

Цікавасць да праблемы асобы была відавочнай і на першым этапе развіцця ваеннай прозы, але галоўная ўвага скіроўвалася ў той час на праблему героя-пераможцы, самаахвярнасць і масавасць барацьбы. У 1960-я гады ваенная проза звярнулася да негероя, звычайнага чалавека, дакладней, да Асобы, у тым ліку і да ворага ("Pamietnik antybohatera" (1961) К. Філіповіча, "Pasazerka" (1962) З.Пасмыш, "Суд у слабадзе" (1977) В. Казько), да праблемы пераўтварэння партызанскага лідэра ў дыктатара ("Boldyn" (1969) Е. Путраманта). Усім славянскім літаратурам на гэтым этапе ўласціва ўвага да чалавечага аспекту, да супярэчлівасці паводзін, матывацыйнай сферы, якая рэгулюе дзеянні і ўчынкі, да сістэмы духоўных каштоўнасцей з мэтай выпрабавання чалавека, гераічнага і антыгераічнага ў ім. І героі, і негероі даследуюцца як ахвяры вайны. Гераічны пафас перамогі, які пераважаў у літаратры пра вайну, пакрысе саступае месца гуманізму трагічнаму, асэнсаванню трагедыі вайны і трагізму чалавечага існавання ў эпоху войнаў і канцэнтрацыйных лагераў. Фашызм успрымаецца як праява розных сацыяльных сістэм і тых, што абвяшчаліся дыяметральна супрацьлеглымі.

Выразна заяўляе пра сябе сюжэтна-кампазіцыйная сітуацыя выпрабавання (смерцю, адзінотай, памяццю, каханнем), якую можна разглядаць як аснову ваеннай прозы, найбольш адэкватную для чалавека на вайне. Для сітуацыі выпрабавання характэрныя прынцыпова новыя суадносіны пафасу і канфлікту, узмацненне праблемы адказнасці, унутраны маральны канфлікт, выбар як праблема і як сюжэтны стрыжань.

Выпрабаванне каханнем можна напрыклад, прасачыць у аповесці, у якой на вайне супрацьпастаўлена прыгожае пачуццё, настолькі арганічнае і неабходнае для чалавека, што яно духоўна перамагае вайну, яе абсурд і пачварнасць. Трагічны сюжэт пра Рамэо і Джульету, які можна ўбачыць у творах В. Астафьева ("Пастух і пастушка"), В. Быкава ("Альпійская балада"), Я. Отчанашака ("Рамэо, Джульета і цемра"), Р. Яшыка ("Плошча святой Альжбеты"), набывае ў кантэксце літаратуры пра другую сусветную вайну адметны сэнс. Усе чатыры аповесці набліжаюцца да балады, маюць вызначальны лірычны пафас, характар сюжэтапабудовы, тып героя, суадносіны паміж апавядальнасцю, споведдзю і лірызмам. Вайна перастае быць толькі фонам, на якім разыгрываюцца вечныя праблемы і пачуцці. Перад намі новыя акцэнты, новыя мэты ў мастацкім выяўленні вайны – асэнсаванне яе як трагедыі агульначалавечай.

Гаворачы пра філасофскую функцыю ваеннай прозы і яе ўвасабленне ў паэтыцы, нельга не прыгадаць экзістэнцыялізм, комплекс філасофскіх ідэй, які паўплываў, бадай, на ўсё мастацтва другой паловы XX стагоддзя, у тым ліку і на славянскія літаратуры. Экзістэнцыяналізм прапанаваў новы погляд на чалавека, новы аспект чалавеказнаўства.

Прымаючы трагізм абставінаў і ваеннага лёсу людзей, славянскія аўтары, прынамсі, савецкія, асабліва тыя аўтары, што ваявалі на фронце, намагаліся абараніць чалавека, свядомага ў антыфашысцкім выбары, здольнага пераадолець свой "унутраны", але не біялагічны фашызм. Гэта тычыцца вобразаў герояў антыфашысцкай барацьбы, якія



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

адпавядалі рэчаіснасці, працягвалі гуманістычныя народныя традыцыі ("Сотнікаў" В. Быкава, раманы М. Лаліча "Разрыў" (1955), "Лялейская гара" (1957), "Аблава" (1960)).

У славянскай прозе пераважае іншае разуменне чалавека і антыфашысцкай барацьбы, чым, напрыклад, у рамане чэшскага пісьменніка Ёзафа Шкворацкага "Zbabelci" (1958), дзе на першым плане – адзінокі аўтсайдэр і яго "плынь свядомасці", часам, у падсвядомасці.

Славянская ваенная проза, ставячы чалавека ў экзістэнцыяльныя абставіны, далёка не заўсёды цалкам прымае экзістэнцыялізм як комплекс ідэй, нярэдка спрачаецца з ім. Умовы развіцця мастацтва пры таталітарных рэжымах не спрыялі свабодзе творчасці, выказванню ўсёй праўды. Скажонай з'яўляецца і літаратура пра вайну. Многія кнігі былі забароненыя і не маглі дайсці да чытача.

Ва ўсіх славянскіх літаратурах прасочвалася агульная тэндэнцыя эвалюцыі мастацка-вобразнай сістэмы ў творах пра вайну: ад дакументальнай і хронікі да філасофскага асэнсавання факта, ад рамантычный героікі да выпрабавання крытэрыяў гераічнага, ад сацыяльна-эпічных форм да прыпавесці, ад літаратуры пра вайну да ваеннай прозы, якая фарміруецца ў межах больш шырокага тэматычнага феномена. Ваенная проза, якая замацавалася ў 1960-я гады, такім чынам, выконвае і яшчэ адну функцыю – вяртанне да мастацтва праз новую экзістэнцыяльную паэтыку.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова

## Літаратура

1. Шаблоўская, І.В. Сусветная літаратура ў беларускай прасторы: Рэцэпцыя. Тыпалогія. Кантакты / І.В. Шаблоўская; прадм. Г. Бутырчык. – Мінск: Радыёла Плюс, 2007. – 304 с.